■ Рэха публікацыі

# «Гасцінец»

**Так называўся артыкул, які «Звязда» надрукавала 21 мая сёлетняга года. Наш чытач і аўтар Уладзімір ЛОГАШ распавёў пра старадаўнюю дарогу (гасцінец), што пралягае ў Навагрудскім і Дзятлаўскім раёнах. Частка гэтай дарогі на Навагрудчыне пакуль з гравійным пакрыццём і патрабуе асфальтавання, асабліва з улікам развіцця курортнай зоны «Радона», а цяпер і яшчэ аднаго санаторыя. Што, у сваю чаргу, стварае выдатныя магчымасці для развіцця турысцка-экскурсійнай справы.**

Рэдакцыя атрымала адказ на публікацыю за подпісам **намесніка старшыні Гродзенскага аблвыканкама Уладзіміра ДЗЯШКО:**

«Артыкул «Гасцінец» разгледжаны Гродзенскім абласным выканаўчым камітэтам.

Паведамляем, што з 10 614 км мясцовых аўтамабільных дарог Гродзенскай вобласці 4576 км (43,1%) маюць асфальтабетоннае пакрыццё. У сувязі з недастатковым выдзяленнем сродкаў на рамонт гэтых дарог 95% з іх эксплуатуюцца з пратэрмінаванымі міжрамонтнымі тэрмінамі. Таму першараднай задачай дарожных арганізацый з'яўляецца захаванне існуючых аўтадарог з асфальтабетонным пакрыццём.

Штогод сумесна з раённымі выканаўчымі камітэтамі пад выдзеления ліміту грашовых сродкаў фарміруецца пералік аб'ектаў, якія маюць сацыяльна-эканамічнае значэнне для раёна і патрабуюць першачарговага рамонту.

Аўтамабільная дарога Н-6006 «Навагрудак — Боцкавічы — санаторый «Радон» мае агульную працягласць 22,486 км, у тым ліку з асфальтабетонным пакрыццём — 9,753 км, з гравійным — 12,733 км. З прычыны недахопу фінансавых сродкаў асфальтаванне ўчастка гэтай дарогі сёлета не плануецца. Гэтае пытанне можа быць разгледжана ў залежнасці ад ліміту фінансавання на рамонт і ўтрыманне аўтамабільных дарог пры фарміраванні праграм на наступныя гады».

Такім чынам, у найбліжэйшы час чакаць завяршэння асфальтавання гасцінца не даводзіцца. Аднак абнадзейвае ўжо тое, што ў Гродзенскім аблвыканкаме праблему разумеюць і ў перспектыве могуць вырашыць. Хацелася б, вядома, каб гэта адбылося як мага хутчэй.

**Барыс ПРАКОПЧЫК**
*prakopchik@zviazda.by*

■ Пасля пісьма

# ПРЫГАЖОСЦЬ — УЖО ЁСЦЬ. А ПАРАДАК — БУДЗЕ?

*«Наша вёска невялікая і вельмі прыгожая. Побач лес, луг, рэчка,* — пісала ў рэдакцыю наша **пастаянная чытачка Валянціна СТАХНО з вёскі Лугавая Капыльскага раёна.** *— Але, нягледзячы на гэта, у нас шмат і закінутых падворкаў. Асобныя дамы, праўда, разнасілі, а вось хлявы пазаставаліся і цяпер зарастаюць травой і кустоўем, становяцца звалкамі смецця. Яно ў нас нават каля крамы ляжыць. І гэта, відаць, нікога не турбуе...»*

Па просьбе рэдакцыі ліст спадарыні Стахно быў разгледжаны Капыльскім райвыканкамам. Рэдакцыі і аўтарцы звароту накіраваны адказ, у якім, у прыватнасці, паведамляецца, што «факт парушэння санітарных правілаў утрымання населеных пунктаў у вёсцы Лугавая пацвердзіўся».

Слабада-Кучынскім сельвыканкамам штогод праводзяцца работы па навядзенні парадку ў вёсцы Лугавая. За апошнія 4 гады знесены 3 старыя будынкі, 8 дамоў з ліку пустуючых прыняты наследнікамі ў спадчыну альбо прададзены і прыведзены ў належны стан. Ліквідаваны 6 стыхійных смеццевых звалак. Арганізацыяй «Капыльская ЖКГ» заключаны дамовы з уласнікамі дамоў на вываз бытавога смецця. Жыхарам вёскі Лугавая выдадзена 12 прадпісанняў аб правядзенні абкошвання прысядзібных тэрыторый, зносу і рамонту агароджаў, зносу састарэлых пабудоў.

Слабада-Кучынскім сельвыканкамам сумесна з прадпрыемствам «Саўгас Лясное» праведзены абкос пустуючых участкаў, ліквідаваны 2 стыхійныя звалкі смецця, скошана пляцоўка вакол крамы. Выкананне патрабаванняў, змешчаных у прадпісаннях жыхарам вёскі, застаецца на кантролі

ДЛЯ ЗВАРОТАЎ ZVAROT@ZVIAZDA.BY ДЛЯ ЗВАРОТАЎ

■ Ведай нашых!

# СТВАРЫ СВОЙ СВЕТ

**Выставы бываюць розныя. Ёсць, у прыватнасці, выставы-адкрыцці — новых імён, новых майстроў. Не так даўно ў нашай бібліятэцы № 8 было прадстаўлена 30 работ цудоўнай майстрыхі Галіны Боевай.**



Галіна Мікалаеўна — гамяльчанка, з залатым медалём скончыла сярэднюю школу № 12, вучылася ў Магілёўскім медвучылішчы, у Віцебскім медыцынскім універсітэце. Працуе правізарам.

Яшчэ са школы ў яе было шмат захапленняў, але адным з самых галоўных стала вышыўка крыжам, бо ў доме яе суседкі і нянькі, бабулі Праскоўі, вышывалася ці не ўсё: навалачкі, прасціны, насценныя дываны... Фіранкі і абрусы вязаліся кручком. І падобнай прыгажосці дзяўчынка не бачыла больш нідзе і ніколі! А з гадамі стала ствараць сама.

Вышывае Галіна, як правіла, не асобныя творы, а серыі. Самая любімая — «Архітэктура свету». Цяпер яна ўключае 8 работ: «Замак Нойшвайнштайн», «Альпійскія каровы», «Венецыя», «Залаты павільён», Грэчаскія прыступкі», «Корсіка», «Таскана», «Тадж-Махал». На памерах — карціны невялікія, але ж для іх выканання спатрэбіліся розныя віды шыўкоў: крыж, паўкрыж, чвэрць крыжа, змешванне нітак, французскі вузельчык...



Галіна Боева.

Прыцягваюць увагу і вышыўкі вады, хваляў. Гэтай стыхіі прысвечана серыя «Маякі».

Галіна Боева як майстрыха мае свой непаўторны почырк, сваё адчуванне колеру. Апошнія яе працы — рамонкавае і лавандавае поле — самыя складаныя. Над імі яна працавала тры з паловай гады. Але ж талент Галіны Мікалаеўны праяўляецца не толькі ў вышыўцы. Яна любіць шыць і вязаць, шмат гадоў займаецца пакаёвымі кветкамі, архідэямі... А ўсяго ў яе кватэры каля сотні хатніх раслін.

**Антаніна УВАРАВА, загадчыца бібліятэкі.**
*г. Гомель*

■ Людзі і лёсы

# ДОЎГІ ШЛЯХ ДАДОМУ

## Як сёстры-падлеткі прайшлі дзве тысячы кіламетраў па занятай немцамі тэрыторыі

**«...Мне дзевяноста гадоў і расказваць пра сваё жыццё я магу доўга», — з усмешкай папярэджвае заслужаная настаўніца Беларусі Тамара Васільеўна Сушкова. Яна і сапраўды цудоўная апавядальніца — памятае драбнюткія дэталі свайго ўнікальнага, багатага на падзеі жыцця. А таму — тут і зараз — толькі фрагмент успамінаў аб тым, як у час выпрабаванняў не па гадах сталелі дзеці, як праяўляліся характары людзей.**

Тамара Васільеўна нарадзілася на Данбасе. Бацьку накіравалі туды на аднаўленне шахт. Але ў 1939-м годзе ён памёр, і маці вярнулася на радзіму.

— Мінск мне здаўся надзвычай прыгожым, — распавядае Тамара Васільеўна. — Чысціня, парадак, шматпавярховыя дамы, крамы... На вуліцы Савецкай (сёння праспект Незалежнасці) — дрaўляныя тратуары, брусчатка, трамваі...

Кватэра іх бабулі была ў падвальным памяшканні дома №11 па вуліцы Мяснікова. Два цемнаватыя пакойчыкі, але з водаправодам, што па тых часах падалося раскошай.

У 1941-м Тамара з сястрой-аднагодкай скончылі восьмы клас у школе № 12 і на канікулах вырашылі з'ездзіць у госці — на Данбас, у Енакіева. Маці збірала іх у дарогу, а суседкі прыгаворвалі: «Толькі б не было вайны...»

— З Мінска мы выехалі 19 чэрвеня, — успамінае Тамара Васільеўна. — У той дзень у горадзе было шмат ваенных. Вайна нібы лунала ў паветры, і мама ўвесь час плакала...

У Енакіева прыбылі 22 чэрвеня і ў 11 гадзін па радыё пачулі пра вераломны напад... «Навошта ж мы прыехалі?», — заплакала я. Кінуліся з сястрой назад на вакзал, але нас туды ўжо не пусцілі.

«У гасцях», калі можна гэтак сказаць, мы прабылі да студзеня 1942 года. На Данбас спачатку прыйшлі італьянцы, а ў снежні — немцы. Адразу ж пачаліся аблавы на камуністаў, камсамольцаў, яўрэяў, з'явіліся аб'явы пра тое, што за забітага немца будуць расстраляны жыхары з дзесяці дамоў справа і злева. Амаль усе нямецкія загады заканчваліся словам «расстрэл»... Мы з Жэняй канчаткова зразумелі, што трэба з'язджаць. Задумалі перайсці лінію фронту і дабрацца да сваіх.

У дарогу нас збіралі грамадой: нехта прынёс паліто, нехта — хустку, нехта — буркі, нехта — галёшы, людзі напяклі аладак, далі грошай, і мы пайшлі. Курс трымалі па слупах высакавольтнай лініі. Па дарозе прасілі міласціну, шукалі, дзе пераначаваць. Да багатых гаспадароў не стукаліся (ведалі, што не пусцяць), знаходзілі хаткі-халупы. Аднойчы ледзь не памерзлі, бо не пускаў ніхто.

Так мы ішлі ад вёскі да вёскі і ўсё ж такі дабраліся да Ніжнедняпроўска. Наперадзе была рака. Па лёдзе не перайсці было — немцы стралялі, па мосце — не пускалі. Людзі тады ішлі натоўпамі. Нам падказалі дачакацца цемры і залезці ў таварняк, які паедзе ў Днепрапятроўск. Мы так і зрабілі: цягнік пераехаў мост і прывёз нас у патрэбнае месца. Праўда, холад у вагоне быў проста страшэнны, жалеза настыла...

Мы ўжо рыхтаваліся загінуць, як раптам чуем: ідуць немцы, стукаюць па вагонах, вызначаюць, пустыя ці не. Дайшлі да нас, адкрылі дзверы, пасвяцілі ліхтаром. Усе, хто з намі ехаў, забіліся ў кут, а мы з Жэняй апынуліся наперадзе. Немцы сказалі: «О, медхен!» — забралі і павялі ў прывакзальную турму, у падвал. Але ж там палілася буржуйка і было цёпла!.. Адзін мужчына, праўда, страшна нерваваўся: казаў, што нас расстраляюць...

Ноччу і сапраўды прыйшоў немец з перакладчыцай, усіх абшукалі і дапыталі. Мы сказалі, што хочам даехаць да Мінска, дзе жыве наша мама... А калі чарга дайшла да таго мужчыны, ён упаў на калені, абхапіў рукамі боты немца і стаў галасіць: «Пан, я ненавіджу камуністаў, ненавіджу савецкую ўладу! Я ўвесь час вас чакаў!..» Немец грэбліва, ботам адштурхнуў яго... Так мы ўпершыню ўбачылі здрадніка.

Раніцай нас зноў дапытвалі, але расстрэльваць не сталі — адпусцілі. Нейкі чалавек падказаў, што нам лепш ісці на Крэменчуг. Адлегласць — 200 кіламетраў, але мы пайшлі — да Крэменчуга, потым — да Чарнігава, да Жлобіна, Гомеля... Мы так хацелі дабрацца дамоў, што нідзе не затрымліваліся больш, як на дзень, ішлі, нягледзячы нават на мароз пад 40 градусаў! А мы ж былі ў дзіравых бурках, у лёгкіх паліто, абматаныя хусткамі...

Потым я падлічыла, што па акупаванай тэрыторыі мы прайшлі дзве тысячы кіламетраў! Немцы нас затрымлівалі, паліцаі — таксама... Памятаю, сталі абшукваць: прымусілі зняць хусткі. Пытаюць: «Бабулі, куды вы ідзяце?..» Што не дзіўна было: твары ў нас змарнелыя, у валасах каўтуны...

Але ж вось, нарэшце, мы ў Беларусі. Божа мой! Пастукаеш у любую хаціну — і цябе пускаюць...

У першай жа — гаспадыня, помню, з чыгуна насыпала на стол бульбы ў мундзірах, сказала: «Выбірайце лепшую і ешце». Дык мы не выбіралі... І не чысцілі... Елі, пакуль сорамна не стала. А калі нам яшчэ і па кубку малака прынеслі... Шчасце было невыказнае!

Карацей, ісці нам стала нашмат лягчэй, але ж я захварэла — стала кашляць крывёй. У той час лютаваў тыф, людзі баяліся эпідэміі. Памятаю, мы папрасіліся ў хату на начлег, я прытулілася да печкі і пачала трызніць. Гаспадыня спытала Жэню: «Гэтая дзяўчынка хворая?» Сястра, пабаяўшыся выгнання на вуліцу, адказала: «Не, яна проста стамілася». Мяне паклалі на лаву, і гаспадыня паслала сына па фельчара. Той змераў мне тэмпературу і сказаў: «Сорак адзін... Трэба везці ў бальніцу». Нібы скрозь туман я чула, што ў Асіповічах бальніца дакладна ёсць, а ў Пухавічах — яшчэ невядома.

У старасты гаспадыня папрасіла каня, мяне паклалі на воз, накрылі коўдрай, і сын гаспадыні павёз нас у Асіповічы. Каб трапіць туды, трэба было на сорак кіламетраў вярнуцца назад. «Назад мы не паедзем! — кажа раптам сястра. — Хоць пехам, але наперад». «Добра, — згадзіўся хлопец, — павязу тады ў Пухавічы...»

На шчасце, там таксама была бальніца. Мяне паклалі ў палату да парадзіх (іншага месца там не было). Доктар пасля агляду напісаў на паперцы: «Двухбаковае крупознае запаленне лёгкіх». З гэтай запіскай Жэня пайшла ў Мінск. І калі нарэшце дабралася, пазваніла ў дзверы, яе не пазнала родная маці (на той час яна была ў партызанскім атрадзе і прыйшла на заданне ў горад). Пусціўшы ў кватэру жабрачку, мама падумала: «Можа, і мае дочкі недзе жабруюць...» А далей быў такі дыялог: «Дзяўчынка, ідзі паеш!» — «Мамачка, ты мяне не пазнала?» — «Ой, Томачка?!» — «Не, я Жэнечка!»

— Назаўтра, на досвітку мама пайшла ў Пухавічы, — працягвае аповед Тамара Васільеўна. — Думала, калі не застане мяне жывой, дык хоць пахавае (бацька наш таксама ад запалення лёгкіх памёр)...

Дарога была вельмі небяспечнай, правяралі ўсіх вельмі строга, але маме ўдалося прайсці. Убачыўшы мяне — слабую, знясіленую, яна сказала: «Нічога, дачушка, хутка нашы прыйдуць!» Гэтыя словы былі найлепшымі лекамі! Не толькі для мяне: У суседняй палаце ляжалі палонныя. Ім з велізарнай рызыкай мама раздала лісточкі. І ад гэтага, як мне здалося, усе адразу ж сталі папраўляцца: такую яны давалі надзею...

А да галоўнага ўрача бальніцы мама пайшла з прапановай: у мяне, маўляў, няма грошай, але ёсць рукі. Я магу шыць для вас, толькі дапамажыце выратаваць дачку. І дакторка пагадзілася. Мама стала шыць, а мне за гэта кожны дзень давалі малако і хлеб. Я пачала папраўляцца.

Аднойчы мама прыходзіць і кажа: «Томачка, збірайся, нам трэба сыходзіць. У мяне ёсць падазрэнне... Дакторка замовіла сабе начную кашулю з карункамі...» І мы, дачакаўшыся цемры, сышлі. Цягнуліся па нейкіх тарфяніках (я хісталася яшчэ ад слабасці). Але раптам мы ўбачылі агеньчыкі. Прыйшлі ў вёску, пастукаліся ў хату. А там — чаканне Вялікадня: гаспадыня вешае фіранкі...

У гэтай хаце мы пераначавалі. Назаўтра нам заставалася адолець сем кіламетраў да Дукоры. Адтуль да Мінска хадзілі грузавікі...

Вось такім было наша вяртанне дадому.

**Запісала Валянціна ПАЛІКАНІНА**